# Браты-падпольшчыкі Сухавы

Яны былі сярод першых, хто ў передваенныя гады прыйшоў праца-ваць на толькі што етвораны Гомельскі падшыпнікавы завод. Прадпрыемства набірала сілу, яго вырабы заваёўвалі большую славу. Свой уклад у здабытке маладога калектыву ўносілі і браты Валянцін і Міхаіл Сухавы.

Але грымнула Вялікая Айчынная, і лес унёс карэктывы ў іх планы. Застаўшыся на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі, камуністы Сухавы разам з тысячамі гамяльчан уключыліся ў оарацьбу з гітлераўскімі захопнікамі. На падшыпнікавым заводзе ў жніўні 1941 года была створана падпольная трупа на чале з Валянцінам Іванавічам Сухавым, у якую ўваходзіў і яго брат Міхаіл. Яны дзейнічалі ў цеснай сувязі з іншымі патрыётамі горада — кіраўніком падпольнай трупы на фабрыцы «Палесдрук» Ц. С. Барадзіным, падпольшчыкам Раманам Цімафеенкам і іншымі.

Нядоўга праіснавала падпольная грула Сухавых. Фашысцкім лазутчыкам удалося напасці на след патрыётаў і арыштаваць іх. Ні допыты, ні катаванні не зламілі волі падпольшчыкаў. У снежні 1941 года браты-камуністы В. І. і М. І. Сухавы былі расстраляны.

Патрыёты загінулі, але іх подзвіг, імёны на вечна застануцца ў памяці народнай. Працаўнікі дзяржаўнага падшыпнікавага завода вырашылі ўвекавечыць памяць аб былых членах калектыву прадпрыемства братоў Сухавых — у 40-годдзе з дня іх гібелі ўстанавіць мемарыяльную дошку,

У сувязі з гэтым на заводзе адбыўся мітынг. З болем у сэрцы гаварылі аб тых, хто загінуў дзеля нашага шчасця, дзеля міру на зямлі, сакра тар партбюро прадпрыемства І. В. Грывалаў, ватэран вайны, удзельнік гераічнай бітвы пад Масквой у еяежні 1941 года, аўтакранаўшчык М. Р. Кавалёў, брыгадзір аператараўна-ладчыкаў В. Р. Падцерабкоў.

— Юнакі і дзяўчаты майго ўзросту, — са слязамі на вачах сказала сакратар камітэта камсамола завода Т. М. Шэндзерава, — ведаем аб вайне з расказаў ветэранаў, літаратуры, кінафільмаў. Цяжкае выпрабаванне выпала на долю старшага пакалення. І мы помнім аб гэтым, мы ўдзячныя былым воінам за тое, што яны ішлі на подзвіг за свабоду нашай Айчыны, за шчаслівы сённяшні дзекь.

Права зняць пакрывала з мемарыяльнай дошкі прадастаўляецца ўдзельніку вайны, падпалкоўніку ў адстаўцы, работнику завода У. А. Бадрову. На ей залацістымі літарамі высечана:

«З жніўня па снежань 1941-га на заводзе актыўна дзейшчаля патчычтычная падпольная трупа ў саставе камуністаў братоў Сухавых, Валянціна Іванавіча (кіраўнік трупы) і Міхаіла Іванавіча.

Расстраляны нямецка-фашыецкімі захопнікамі ў снежні 1941 года».

Ніхто не забыты, нішто не забыта.